АСТРАМЕЧАЎСКІ РУКАПІС

БРЭСЦКІ РАЁННЫ КРАЯЗНАЎЧЫ АЛЬМАНАХ

№ 4 [8]•2014



Беларуская марсельеза

«Беларуская марсельеза» — назва, якой азначалі дзве розныя беларускія патрыятычныя песні.

1. У пач. XX ст. з'явілася «Адвеку мы спалі», аўтар словаў раней быў невядомым, і лічылася, што песня была пачута ў першы раз у 1906, «сярод рэвалюцыйнага сялянства Слуцкага ўезда Мінскай губерні». Пазней было высветлена, што аўтарам словаў быў паэт А.А. Мікульчык. Варыянт, датаваны 1917 годам, са словамі «...што трэба зладзеяў пабіць», прыпісваўся Уладзіславу Галубку. Песню шырока называлі «Беларускай марсельезай» за патрыятычны і рэвалюцыйны пафас словаў, але спявалі яе на іншую мелодыю, чым «La Marseillaise». У 1920-я і, верагодна, пазней, гэтая песня была фактычным гімнам БССР і беларускага нацыянальнага руху за мяжой.

2. У канцы 1980-х — пачатку 1990-х, у беларускім патрыятычным асяроддзі назвай «беларуская марсельеза» азначалі, час ад часу, верш Багдановіча «Пагоня», спяваны на мелодыю «La Marseillaise».
   Вядомыя розныя варыяцыі тэксту «Адвеку мы спалі», у адным з іх першыя звароткі гучаць так:

   Адвеку мы спалі і нас разбудзілі,
   Пазналі, што трэба рабіць,
   Што трэба свабоды, зямлі чалавеку,
   Што трэ' лепшай долі здабыць,
   Бо што ж то за марная доля такая,
   Для іншых карысці працуй.
   Па нашых абшарах чужынец гуляе,
   А ты ў родным краі гаруй.



Картина Гроттгера «Повстанцы Калиновского» Беларуская энцыклапедыя. У 18 т. Т. 10. — Мінск, 2000

АСТРАМЕЧАЎСКІ РУКАПІС

БРЭСЦКІ РАЁННЫ КРАЯЗНАЎЧЫ АЛЬМАНАХ

НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНАЕ ЛІТАРАТУРНАЕ ВЫДАННЕ

БРЭСЦКІ РАЁННЫ
ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ
АДДЗЕЛ ІДЭАЛАГІЧНАЙ РАБОТЫ, КУЛЬТУРЫ І ПА СПРАВАХ МОЛАДЗІ РАЙВЫКАНКАМА
РАЁННЫ ДОМ РАМЁСТВАЎ

Кантакты:
(+375 29) 20-161-02
(+375 162) 965-957
e-mail: kotlas@tut.by

Падпісана да друку 15.12.2014.
Фармат 70x100 1/16. Гарнітура PF Agora Serif Pro.
Тыраж 99 экз. Ум. друк. арк. 8,10.
Друк цыфравы. Надрукавана ТДА «Артлайнсіці»,
г. Брэст, вул. Карбышава, 74.
Арыгінал макет падрыхтаваны
ТАА «Паліграфіка», зак. 400-2014.
Пасв. 2/2 ад 16.08.2013, пасв. 1/22 ад 16.08.2013,
вул. Стафеева, 21, 224007, г. Брэст
тэл. (+375 162) 49-26-79, www.poligrafika.by

1-я с. вокладкі: Алена Рэвуцкая. Калядная песня. 2005 г.

1-я і 4-я с. вокладкі: Зінаіда Кайко. Святошны рушнік


У афармленні выкарыстаны выцінанкі мастачкі Святланы Вяль

Выходзіць штоквартальна
Мова: беларуская, руская

№ 4 [8]•2014


У НУМАРЫ:

Так выглядае архіўны «Рукапіс 127/56» Ягелонскай бібліятэкі г. Кракава. Нотны запіс выкананы ў старажытным манеры XVII стагоддзя



Копія захоўваецца ў аддзеле рукапісаў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа НАН. Паўторна зроблена намаганнямі і за сродкі СПК «Астрамечава» спецыяльна для альманаха «Астрамечаўскі рукапіс»

АСТРАМЕЧАВА
І АСТРАМЕЧАЎЦЫ



Книга «Апостол» — старейшее рукописное издание XVI–XVII веков

**Принадлежала Лыщицкой, позже Остромечевской церкви.
В 1915 г. при эвакуации была закопана в землю, отчего и пострадала**



Издание хранится в Брестском областном краеведческом музее


О духовно-нравственном воспитании подрастающего поколения

размышляет директор Остромечевской детской школы искусств Татьяна ПРОКОПОВИЧ



Вопрос духовно-нравственного воспитания детей является одной из ключевых проблем, стоящих перед каждым родителем, обществом и государством в целом. Нельзя не заметить, что сегодня в представлениях детей духовные ценности часто вытесняются материальными, и, соответственно, среди целей и желаний детей начинают преобладать узколичные, «продовольственно-вещевые» по характеру. Поэтому так важно обращать внимание на воспитание души, на духовно-нравственное состояние нашей молодежи.

Детство всегда с надеждой обращено в будущее, и дети, как правило, ждут, чтобы взрослые показали им путь, который определит им жизнь. Для этого необходимо создание и полноценное функционирование социально открытого пространства, где усилия всех — семьи, школы, учреждений дополнительного образования, общественных организаций, культуры и спорта, традиционных религий — будут направлены на освоение системы общечеловеческих ценностей, культурных, духовных и нравственных ценностей народа Беларуси.


ДИПЛОМ

награждается

Воскресная школа
Свято - Михайловского православного
прихода д. Остромечево
Брестского районного благочиния
Руководитель коллектива
Ольга Моляренко

за участие в XI фестивале
православных духовных песнопений
"Пойте Богу нашему, пойте..."


ДИПЛОМ

награждается

Хор воскресной школы
Свято-Михайловского прихода д. Остромечево
Брестского районного благочиния

"Пойте Богу нашему, пойте..."


ГРАМОТА

награждается

Инструментальный ансамбль
"Астрамечаўскія жаўручкі""
ДШИ агрогородка Остромечево

Руководитель Алла Ильюк

за участие в XIII фестивале
православных духовных песнопений
"ПОЙТЕ БОГУ НАШЕМУ, ПОЙТЕ.."



«Астрамечаўскія жаўрукі» и «Праздничный хор» Остромечевской ДШИ на XIII фестивале духовных песнопений

Воскресная школа — явление очень старое. Корни его лежат в церковно-приходской школе, которая дала начальное образование многим выдающимся людям Беларуси, России и Украины. Ведь это было почти единственное место, где начальное образование — грамоту, устный счет, основы истории и Закона Божьего — мог получить практически каждый ребенок, независимо от его социального положения или материального благополучия.

Основной целью современной воскресной школы является обучение детей основам духовной грамотности. Сегодня дети получают образование в государственных школах на очень высоком уровне, но их духовное и нравственное развитие, в силу обстоятельств, сложившихся в нашем государстве за последние годы, оставляет желать лучшего.

Воскресной школе нужно быть источником бесценных духовных знаний, помогать детям обрести нравственный стержень, который не позволит им сбиться в жизни с правильного пути. Именно поэтому воскресная школа должна существовать при каждом храме.

Действует воскресная школа для детей и при Свято-Михайловском храме агрогородка Остромечево. Преподаватель Жанна Леонидовна Скалдуцкая — выпускница Слонимского Духовного училища — знакомит детей с многообразным и возвышенным миром православия. В школе изучается Закон Божий, Библейская история, история церкви. Уроки проходят в хоровом классе Остромечевской детской школы искусств. Во время Крещенской недели учебный класс ежегодно освящается священником Свято-Михайловской церкви иереем Владимиром Свидуновичем.



Репетиция «Праздничного хора» (рук. Ольга Николаевна Маляренко и иерей Владимир Свидунович — в центре)



Ансамбль цимбалистов «Астрамечаўскія жаўрукі»



Цимбалистка Алина Дмитренко

Ученики и учителя воскресной школы, Остромечевской детской школы искусств и районного Дома ремесел работают в тесном сотрудничестве. Для детей и родителей устраиваются утренники на Рождество и Пасху. На Святки ребята посещают пожилых прихожан, инвалидов, вручают им подарки. На Вербное воскресенье дети устраивают выставки поделок и вербные букеты, сделанные своими руками.

К различным праздникам учителя и ученики готовят информационные листки о духовной сути праздника, стихи, интересные и поучительные рассказы для детей и взрослых.

Рождественские встречи

Рождественские концерты в Остромечево стали уже доброй традицией. В 2009 году учителя и ученики Остромечевской ДШИ и районного Дома ремесел организовали праздник, посвященный Рождеству Христову. Выставки, концерты, литературно-музыкальные композиции, духовные стихи, песнопения и мини-спектакли. За эти годы менялись залы, исполнители и приглашенные гости. Но неизменным остается то, что в этот праздник зрители и участники настроены на добро и любовь, которая объединяет людей, соединяет

Традиционная встреча преподавателей Остромечевской ДШИ и районного Дома ремесел с председателем СПК «Остромечево» А.С. Скакуном





Воскресная школа при храме в честь иконы Божией Матери «Всех Скорбящих Радость» г. Бреста в гостях районного Дома ремесел, 2012 г.

церковь земную и небесную, просвещает души и помогает воспитывать наших детей в нравственной чистоте и вере, в милосердии и любви.

Неизменным участником Рождественских концертов является «Праздничный хор» Остромечевской детской школы искусств (руководитель Ольга Николаевна Маляренко). Репертуар «Праздничного хора» становится более широким и разнообразным. Он рождается из общения детей с отцом Владимиром — священником Свято-Михайловской церкви агрогородка Остромечево, преподавателем воскресной школы Жанной Леонидовной Скалдуцкой, матушкой Ириной (или Ириной Свидунович), которая, обладая замечательным по красоте и силе голосом, любезно согласилась исполнять сольные партии хора. Ребята могут делиться радостью общения друг с другом, с музыкой, участвуя в Рождественских концертах, на православных выставках и фестивалях, в богослужебной жизни прихода. Мы надеемся, что помогаем каждому ребенку найти и развить таланты, данные ему Богом, что через общение, труд, творчество дети открывают для себя мир добра, любви, красоты, и те семена, которые попадут на благодатную почву детской души, в дальнейшем прорастут и принесут свои плоды.

- *Музыка С. Подшибякиной, слова Е. Матвиенко «Рождественская песенка».*
- *Музыка С. Марченко, слова М. Лермонтова «Ангел».*
- *Музыка и слова Э. и Д. Реттино «Рождество — время любить».*
- *Фр. Груббер «Святая ночь».*
- *Музыка В. Плешак, слова А. Шульгиной «Рождественская песня».*
- *Музыка В. Вовченко, слова М. Речкина «Волшебный урок».*
- *«Яркая звездочка».*
- *«Елка в Рождество».*
- *Музыка и слова А. Наумовой «Рождество Христово!», «Колыбельная Марии».*
- *«Ангелы в небе».*

Православный фестиваль «Пойте Богу нашему, пойте!»

18 мая 2014 года в Дрогичине прошел XIII фестиваль духовных песнопений «Пойте Богу нашему, пойте». В нем приняли участие 43 детских и молодежных коллектива из Бреста, Кобрина, Березы, Пружан, Каменца, Жабинки и других приходов Брестской епархии, а также хоры Польской автокефальной православной церкви.

Агрогородок Остромечево был представлен двумя коллективами: детским «Праздничным хором» (руководитель Ольга Маляренко) и ансамблем «Астрамечаўскія жаўрукі» (руководитель Алла Ильюк).

По традиции все исполнители духовных песнопений получили благодарности и подарки от Владыки Иоанна. «Праздничному хору» и ансамблю были вручены дипломы и статуэтка «Ангел» — символ фестиваля «Пойте Богу нашему, пойте!», который возвещает об очередном празднике и торжестве духовной православной культуры.

По благословению епископа Брестского и Кобринского Иоанна в Пасхальный период ежегодно уже на протяжении тринадцати лет фестиваль «Пойте Богу нашему, пойте!» проводится в городе Дрогичине. За эти годы он стал местом желанной встречи единомышленников, где люди приобщаются к православным традициям и слову Божьему, где голоса многих певчих звучат подобно голосам ангелов, как будто бы сошедших с небес. И это весьма отрадно. Ведь давно замечено: «чем больше мест для молитвы — тем меньше зла в сердцах людей».

Ученики Остромечевской ДШИ по благословению отца Владимира — настоятеля Свято-Михайловского храма села Остромечево, впервые приняли участие в X фестивале, который проходил в 2012 году. Отец Владимир рассказал о фестивале, помог с репертуаром, обращал внимание на особенности исполнения церковных песнопений. Это уже третий фестиваль «Пойте Богу нашему, пойте!», в котором наши ученики принимают участие. Репертуар пополнился как молитвенными распевами столетней давности, на которых зиждется православная церковь, так и современными духовными произведениями.

Репертуар:

Л. Марченко, М. Лермонтов

- *«Ангел»*
- *«С коленопреклонением»*
- *«Святая земля»*
- *«С тихой утренней зарею»*
- *«Как природа хороша»*
- *«У Иерусалимских гор»*

Слова и мелодии молитвенных песнопений дети пропускают через свои сердца и души, и это позволяет надеяться, что в своей жизни они станут прочной опорой для семьи, веры, Отечества.



Наши культурные бренды



Ансамбль песни «Суседзі» Скоковского СДК (рук. Владимир Юльянович Лабкович)



Народный ансамбль песни «Славия» Мухавецкого ДК (рук. Ирина Викторовна Лис)

ЧАРОЎНЫЯ СПЕВЫ І ПАДАННІ СПАДЧЫНЫ



АПОВЕД бабы Вольгі з Вельямовічаў пра жыццё, вайну і песні



Варабей Вольга Данілаўна, в. Вельямовічы Брэсцкага раёна (1934 г.н., бел., пісьм., правасл., мясцовая)

Як ад немцаў хаваліс

— Добры дзень! Мы з універсітэта, вельмі хочам з Вамі паразмаўляць.

— Я мугу вам пісню заспываты пру Сталіна, вітіранску, я дві знаю. Я председателювы спывала вітіранску пісню. Він ду мэнэ, прывозыв мні пісьмо, пытав мэнэ пру вуйну. Я юму рускала слово в слово: як нашэ сыло палэлы, як два партізаны прійіхалы. Ну, я всё русказала. І за тэх партізанув нам спалэла сыло. Якраз цюю сэрэдыну вэпалылы. Хата наша, тры года було як батько пустройів, і німцы спалэлы йийі. Бо тут якраз партізаны прійіхалы. Партізаны булэ вкопаны в Вельмовычах за кладбішчамы, а німцы стуялы тамо во в Шумыны. І вунэ рубэлы перестрелку, бо после вуйнэ на болоті валялыся німцы пубэты. Рубэлы перестрелку. І тэх партізанув вэслалы в разведку. І йіх ду Ковалевыі дорогі допустэлы і пудбэлы в танковы і вунэ пугурілы, і удэн був мулудэй. Влізлы на клуню, я нэсу якраз яйкі в схрон. Мні було, сідмэй год ішов. Купалы батькі за клунямы, в нас пу тый стороні всё клуні стуялы. Ну, і каждый на свуму полю выкупав схрона. То вжэ зналы, шо вуйна будэ. І выносылы тудэ лахі в схроны. Хатэ запалять, куб лахі ны пугурілы, а я лялькі взяла з гарцём, давай нэсты. Вэйшла на дорогу, йідэ танк.

Я дэвлюся то ні німецкій, бо німецкі тыйі всё булэ Катюшы такійі большыйі. І вунэ пубачілы, шо я іду, сталы і кажуть мні: «Дочка, даліко лі здесь немец?». А я кажу: «Во тамо во в тэх о большых курчях, в Шумыны». Вунэ влізлы на клуню Таньчіного батька і на самый грэбынь, і в біноколь дэвляцця. Пудывэлыся і злізлы, і крічать: «Палімёт впірёд!». Помежду клунямы пруйіхалы с тэм палімётом, кулу нашуго схрона, і пуйіхалы прямо німцям в рукі, а я ж такая, ну шо ж, сідмэй год, за тэм танком быгу і крычу: «Куда вітэ йідытэ, то ж там немцы, то ж там немцы!». Быгу, впаду і знов быгу, і вэрнулась. Вэрнулась, прышла пуд хату і тутака вжэ давай, німцы тэйі давай худэты пу схронах, кідаты гранаты, крічать: «Партызан русі капут!». Всё кідають гранаты в схроны. В нас тут четырнаццыть чулувік убэлы. Тэйі гранаты рузрывалыся. Ой! То вообшэ було страхотте. Ну, і удного партізана. Удэн був вжэ пужылэй, а другі був шэ мулудэй. Я юго так запомніла, того мулудого і того мулудого. Много літ пруйшло і прійіхала юго маты, і пузнакомылася з огрономом. Вуна пріййіхала і там вжэ як вуна з йімы пузнакомылася, с тэм огрономом, а вунэ жылэ во там ныдалэко, огроном. Ну, і вжэ мэ йдэмо з того мітінга, тая Надя, огрономува жінка, так пушла впірёд, а я взаді йду і вжэ пудходым так о сюда пуд хату, вуна кажэ. А, тая маты того мулудого кажэ: «Далэ знаты, шо він погіб вот в этіх краях». А тая Надя, вуна сама з Кушылува, огрономува жінка. Вуна кажэ: «Я Вам нічого ны мугу сказаты, бо я ны здешна, Вам трэба хто тутака здешный». А я вжэ йду, кажу: «Надя, а шо то за удна тётка?». А вуна кажэ: «То тэйі партізаны, шо тут у вуйну пугіблы». А я кажу: «О, то я Вам всютко рускажу як бы вуно зара було». І я юй давай русказуваты. А вуна кажэ: «Сімілетняя девочка, — в ейі слёзы путыклэ, — запомніла моево сына». Я кажу: «Він був на Вас пухожый як крапэлька вудэ, — я кажу, — я глянула зара на Вас і як він був, точно був пухожый на Вас, — я кажу, — такі шчуплынькій, худенькій». І я юй рускавала як вунэ на клуню лазылы, як вунэ йіхалы тэм танком, крічалы: «Палімёт впірёд!». Я кажу: «Я Вас завыду пукажу дэ йіх пудбэлы с тэм танком, скажу Вам, дэ вунэ пухуроняны. Як началэ вунэ йіхаты. Кулу цэрквы там брацка мугіла. А шо там, — кажу, — було хуваты. Іх танка пудбэлы, іх тылько з танка косты пувытягалы тэйі упалэвшы і, — кажу, — там пухуроняны ны уднэ вунэ, — кажу, — там шэ такіх назбыралы, — кажу, — такую брацку мугілу зрубэлы». А вуна кажэ: «О, дочка, хоть тэ мні русказала про моего сыночка всё». Ну, і после того вжэ тая маты зайіхала і я, дурынь, ны спытала, скіль вуна, бо всё гувурэлы такое о і я после Наді кажу: «Чом я йійі ны спытала уткуда вуна, тая баба». І вуна зайіхала, і, мусыть, зайшла тудэ, ну так як о в нас, в городі ідуть там дупэтуюцця там чы в райсабесы, чы в райсполкомы. Зайшла вэдно і русказала. І после вуйнэ вжэ много літ пруйшло, нас зубралы в клубе, дві бабы чы трэ було з Галачова. Німцы забралы, ім було по трынаццать, по чэтырнаццать літ, на прінудітельны руботы в Гірманію іх забралы. І пріййіхав з Брэста корэспондент, і давай пытаты, як тут начіналася вуйна. А о тая Валя Горнічіха кажэ: «Жалко шо здесь нет Хоменкі, він бы всё русказав». Кажу: «Валя, туж Хоменкі шэ і ны було тугдэ, і ны хаты, і нычого, — кажу, — Хоменкі жылэ на Забір'і, — кажу, — бо мэ после вуйнэ, нас батько завів тудэ як німыць сыло спалэв». Бо я польскій язык, сім літ, я польскій язык знала.

Бо ду мого батька пулякі худэлы. Я пупольскі шчыбычу, я … ны рузбырэш мэнэ з пулякамы, шо пуляк, шо я. Я всё, вшыстко розуме. І німецкій я язык, бо худэла в німецку школу, ай, цвай, драй, это ду десяті нас учелы шчітаты понімецкі. Я кажу, я вжэ трі язэка знала: беларускій, польскій і німецкій. Я была вэймэ чуткая, добрэ зренне міла, я мугла бы буты разведчіком. Путайная була, нэц ны скажу, а бігаты. В нас булэ там німецкі курувэ стуялы, там як я кажу, в Шумыны. І там нашы дуйілы дуяркі, ну, нашы рускі. А удён пуляк жынэвся на нашуй девцы, вуна була тожэ дуяркую. І я, тут був, мэйі бабулі сэн, ну, юму, мусыть, було літ двінаццать, такі бальшэй мальчік. Він прыбыжэть сюда: «Олька, пашлі на Шумын!». Я кажу: «Пашлі!» Я як той разведчік бігала, шмэдка була, пу дэрвувы лазыла, німцям букет чырэмуху ламала. Тут булэ німецкі манёбры в нас на гулыці, кухня була, чырвоный сахар рубэв німыць. О, я всё разведувала, всё, той чырвоный сахар вурушэлы. Ну, і, это, зайдым з тэм Петькію. А той Кулік, він поляк, фамілія Кулік, говорыть попольскему. А я вшыстко розуме. Вунэ там гуворать по-польску і там німцям тэм пэрыводыть. А я, бігаемо мэ з Петькую, ныбыто ландышы рвэм, фіялкі на букетік. Вунэ думають, шо діты нэц ны понімають. Вунэ гуворать, а мэ, а я всютко вэслухаю. Ідэм дурогую, я кажу Петькувы, кажу: «Тэ знайіш, шо Кулік гувурэв, шо бэньдзе война, о то бэньдзе война». А він кажэ: «А шо то такое?». Кажу: «Шо тэ нэц ны понімайіш, война, — кажу, — казав шо вуйна о хутко будэ». А він кажэ: «Ну да?!» Я кажу: «Да, ну, — кажу, — я добрэ пунняла, шо бэньдзе война, о то ж бэньдзе война». Я кажу: «Петьку, хутчэй пашлі дудому». Мэ прыходымо, тут мій батько і Таньчын батько, два сусіды, выводять коны з хлівів, запрагаты, йіхаты в полэ зажынаты жэто. Мэ пудбыгаймо, я як быз зуху, задэхалася. Шо мні сім літ. Петька більшый, він хутчэй быжэть, я юго нагнаты ны мугу. Я прыходжу і кажу батькувы: «Ны йідьтэ в полэ, шо мэ будэм рубэты, я бігала на Шумын, Кулік казав, шо будэ война, о то бэньдзе война». І Петька кажэ: «І я тое чув». Батько кажэ: «Васэль, руспрагаймо коны, убыждымо». Ну той Васэль кажэ: «Я вызу ду Марыканьця, ду млына мулоты». А мій батько руспряг куня і знов завів в сарай. Ой, і тугдэ давай, тэйі німцы зрубэлы цэп, Катюша кулу Катюшы, і давай сыло палэты, гранаты в схроны кідаты і всё. І вжэ посля, як вжэ пэрэсталы кідаты гранаты, людэ давай з схронув вэлазыты. І я чую, німыць вэйшов, там кулу сусіднюго схрона став і кажэ: «Хто шэ встався жывэй йідзіце до Малой Ракавіцы, бо тут бэньдзе ідці велькій бой». Я бігом з-пуд схрона, клуня вжэ дугарае, между тэмы усмалкамы, прыходжу пуд хату, хаты вжэ ныма. Хата згуріла, дошч пушов, куры ходять, убмоклы. Батька ныгдэ ны вэдно, маты ранюна, пуд куліном вэрвало усколком, всё гранаты в йійі кінув. О, в матыра кров быжэть з нугі, маты хустку з гулувэ, ногу зав’язала. О, а на нас німцы дэвляцця як тэйі звері, стуят. І тугдэ дэсь батько, а батько, в нас за гуродом стуяв стужок сіна. Батько дэрку вэскубав і вліз туда в тое сіно, і сіном тэм знов заткнувся. І вжэ батько пучув, шо мэ ходымо, гуворымо кулу хаты тэйі спаленыйі, прышов пуд нас. Тутака вжэ сусідка з дытьмэ, вжэ тэйі сусіды і мэ так всі капэлыю пушлэ на тое Забір’е, а то там кажэ Олька жывэ Савэчына з Хоменком. Ой, я пу туму запомніла і кажу Валі, шо тут Хоменкі ны було. Кажу, тут хатэ тылько булэ о пу вэгун, а там, кажу, ныгдэ ны уднэйі хаты ны було,

бо я каждый дэнь туда на той Шумын бігала. Всё слухала, шо той Кулік гуворыть по-польскему, а я пырыводжу на руске. О так, девочкі, було.

— *А якога Вы года нараджэння?*

— З тріццать четвёртуго. І мні о там у городі, я зымою була в сыстрэ, мні пуд вусьмое марта прыслалы такі бальшый кунверт, пісьмо такое прыслалы. І там сусідка прышла ду мэйі сыстрэ і кажэ: «А шо ж тэ за такая вітіранка, ту ж тэ шэ була пацанка». Я кажу: «Ну і шо, шо я була пацанка». Я кажу: «А я, прійіхала удного маты і я юй русказала слово в слово, і, — кажу, — точно сбылося». Як йийі, кажу, сэн пугіб, і русказала, і всё, кажу, тое справдылося. Кажу, скіль бы баба знала, як йийі сэн пугіб, а я, кажу, юй руска..., а юй сказалы, шо в сіх краях. А як він пугіб в сіх краях, а я, кажу, а я юй русказала, як він пугіб. Як на клуню лазыв, як в танковы йіхав, як крічав палімёт впірёд, дэ, кажу, в якіх містах пудбэлы, дэ пухуроняный. Я кажу, і бабы на душі лёкшій стало. Бо вуна взнала і кажэ: «О, дочка сімілетняя і всё мні русказала пру мого сына». І вунэ замувчалы, тая сусідка.

Што спявалі

— Я кажу, от і я вэбылася впірёд, і я о на дускі пачёта в клубе разом з вітіранамы. Чуйіш, дэ якая густэна, дэ шо. Нас збэралы такіх о во і сфутуграфірувалы. Мні булэ всігда прыгласітельнэ на дівятуго мая. Прынысуть прыгласітельнэ, я йіду туда. Тут шэ удна була тётка, вітірана жінка. О, я з ею йіду, з вітіранамы. Там вунэ, это, в кафэ нас выдуть, я ім пісню спываю. Чуйіш зайідымо мэ шэ, по это, давалы на два мужыка бутэлку водкі, угошчалы нас в кафэ в Мутыкалах на дівятуго мая. Ну, і вжэ сталы там, ну, мужыкі, то ж там і мулодчі мужыкі булэ. Вжэ пудупьють, тут в нас був Наді батько, Новік Іван. Тэх як я казала: «Дядя Ваня, Вітэ тэх бляшныків навішалы, — кажу, — хоть бы заспывалы пісню якую вітіранску». А він кажэ: «Нічево, Ольга, я ні вмею». Я кажу: «Шо Вітэ за такій вітіран, бляшныків заслужэлы, — кажу, — а ныякійі пісні ны вэучілы». Я кажу: «Вітіраны, давайтэ я вам заспываю». Мні хлопають, я давай:

Пад зелёнаю ракітой
Рускі раняной лежал,
А в груді штыхом пробітый
Красный орден пріжымал.

— Тыко в мэнэ тугдэ голос був, а шо мні зара вусімдісятый год, дрыжыть весь голос.

Красный орден пріжымал,
Кровь лілася с свежей раны
На істопчаной пісок,
А над нім кружітся ворон,
Чуе ласковый кусок.
Ой, ты, птіца, чёрный ворон,
Шо так вьёсся надо мной?
Ты здобычі не добьёсся,
Я солдат ешчё жывой.
Ты здобычі не дьбьёсся,
Я солдат ешчё жывой.
Перідай-ка, птіца ворон,
Прівет маміньке родной
І жыне маёй любімой
Платок, кровью облітой.
І жыне маёй любімой
Платок, кровью облітой.
Перідайка, птіца ворон,
Прівет маміньке родной,
Што погіб за руску землю
Пад савецкаю звіздой.
Што погіб за руску землю
Пад савецкаю звіздой.

— Ну як?

— *Вельмі прыгожая песня.*

— Нічіво, як мні на восімдісят літ. А я о тую пісню «Свадьба в Малінавке». Я тое кіно бачіла пару раз, як там пудпалэв той стога. Вітэ бачілы?

— Бачылі.

— Як той артіст йідэ на кунёвы і спывае пісню:

Ой прі лужку, прі лужку,
Прі зілёнай волі,
Прі знакомом табуне
Конь гулял па волі.
Прі знакомом табуне
Конь гулял па волі.
Конь гулял па волі,
Салдат па ніволі.
Ой, гуляй-гуляй мой конь
Пока не споймаю.
Як споймаю — зауздаю
Шелкавай уздою.
Тронул шпоры під бока,
Конь летіт стрілою.
Ой, леті-леті мой конь,
Як віхор несіся.
Протів мілый іль боса
Конь остановіся.
Перед воротамы
Стукну копытамы,
Кіль ны вэйдэ моя мыла
С чорнымы бровамы.
Ой, ны вэйшла мыла,
Вэйшла ейі маты.
Здраствуй-здраствуй, любый зять,
Пожалей до хаты.
Я до хаты ны пійду,
Пійду до свэтлэці,
Разбужу я в крепком сне
Красную девіцу.
Девіца устала,
Сон свій одгадала,
Правай ручкай обняла,
Шэй пацелавала.
Ой, ты, парінь маладой,
Не жартуй са мною.
Я заручена с другім,
Не магу с табою.

— Ну шо, девочкі, ніцево я моге пець?

— Вельмі прыгожа.

— Бэньдзе ладне?

— Да.

(Смяецца).

— Вы розумеце цо-небудзь по-польскему?

— Розуме, пятэ через дзесятэ. Ой, я спывала, я була пэршэ запывайло.

Дал ему пріказ на запад,
На чужую старану.
Ухаділі камсамольцы
На гражданскаю вайну.
Ухаділі камсамольцы
На гражданскаю вайну.
Ухаділі — гаварілі,
Што на свете люба жыть.
Ізабільная радная
Слався руская зімля.
Ізабільная радная
Слався руская зімля.

Як жылі

— Вы замужам былі?

— А, в мэнэ був такая п'яныця. Я з йім жыла дваццыть удён год. І він жэв на Сібір'йі. Пушов в армію, там жынэвся на сібірячцы і там став вэймэ пэты, і юго тая сібірячка вэгнала. І тут ныдалэко юго маты жыла, ну, юго родітелі, сыстра з дытьмэ. Усь тутака сусід мій пас курувэ калхозны. І він прійіхав, юму ны було дэ, шо там в тэйі Валькі, свуйіх було трое дытэй, в сыстрэ. Мужэк кінув, в юго сыстрэ. Батько був быз рукі, маты вжэ старая. І той Костя Мурузюк кажэ: «Міша, я тубі пусватаю бабу». О, а я, девочкі, в трінаццать літ. Тут в мэнэ батько пусадэв чырэмыху, вуна так красіво цвыла тая чырэмыха, а после вуйнэ ны було чуго йісты. То ж сыло спалэлы всё.

Шо було йісты? Пулякув вэвызлы за Буг. Нас вэслалы пуд Вылэкі Шчытныкі в тэйі хатэ польскі, на кіломытэр хата ут хаты тэх пулякув. І нас туда вэслалы, йісты ны було чуго, зэмно, палэты ны було чуго. Я цілу зэму пэрэзэмую в лісы. Там ныдалэко лісок такій був. Я ду убіда йіду, зрубаю трэ-штэры бэрозкі, тягну. Прытягну, пурубаю. После убіда знов йіду, бо ныма чэм палэты. І мні було трінаццать літ і я прыйшла в сыло сюда о, на свую батьковшчіну. А тая такая чорна чырэмыха, дуспіла, тэйі ягудэ. А я ж так любэла пу дэрвы лазыты. Влізла я на туюу чырэмыху, рву, вуна такая сладка, тая чырэмыха. І я злазыла з тэйі чырэмыхі, гуля убламэлася і я впала, і вэбыла ліву нугу в суставе. І мэнэ завызлэ, дядько мій мэнэ... Маты пупрусэла, удён пуляк шэ ны вэйіхав, в юго була кубэла свуя. І маты юго пупрусэла, ну, заплатэла юму, помню дваццыть п'ять тэсяч на старэйі грошы дала. Він мэнэ завіз ду Лэшчыч у бульніцу. І там Замулка кажэ: «Ну, шо я тэбэ буду трыматы тут». Утправылы мэнэ в Брэст у бульніцу, вэзвав скору з Брэста той Замулка. Бо я ж ны мугла, я ж, нуга вэбыта, я лыжяла, мэнэ нусэлы. Пуложать на плахту і з уднэйі стурунэуднэ бырэ за два кунці, з другійі друге бырэ і мэнэ так нысуть ду воза, а я ныкудэшна. Шо, нуга вэйшла з суставу. І мэнэ завызлэ в туюу убласную бульніцу на Леніна і там врач був Букач. Вчыпэлы мні два кірпічі, зрубэлы такую вэтяжку. Куб вытягувало ногу. А я вэсла на палку. Рано прэдуть врачі на убход, а я кажу, а я лыжу плачу. А Букач кажэ: «Дочка, ні плачь, ты скоро поправісця, ешчё врача на свадьбу прігласіш». А я кажу: «Ага, пуправлюся на тэх кірпічах, а шо мні кірпічі ногу пуставлять на місцэ». Наплачуся, лыжу, вунэ мэнэ угаварують. Ну й, вэсла я на палучку, і тая нуга мні, шо ж кірпічі направлять. Маты ду мэнэ прійіхала, ну, с свэю сыстрою. Вуна була муя мамулька, тая тётка Пашка. І я йіх прушу, кажу: «Забырітэ мэнэ дудому. Я буду вмыраты». А тэйі... Ну, і маты пушла, там нашла туго врача, а там заведуюшчый був Ільйін фамілія. Казалы, шо він грузін, такій чорный, здаровый дядько. І кажэ: «Забірайте, вы её да вакзала ні давізёте». А тая мамулька просыть, кажэ. А там пудсказала бульнэйі, шо е павозка такая, дядько возыть на павозцы ду вакзала. Ну, тая тётка, мамулька, пушла, пухудэла і сказала вжэ тэм браттям, шо як мэ йійі ду вакзала дунысэмо. Шо ж, на плахты ныcты будут. І він дав туюу павозку, того дядька, мэнэ з тэю плахтую влужэлы в павозку, прывызлэ ду вакзала, прывызлэ ду Лэшчыч. Ну знялэ на вакзале, там пумуглэ люды зняты мэнэ і маты мні кажэ: «Тэ пулыжэ, а я пуйду тутака пупрушу куго, шоб тэбэ дудому, тудэ на хутор, — мэ жылэ там на хуторы, — шоб, — кажэ, — тэбэ завіз дудому». Пушла вуна найшла, вжэ ныч. Той дядько сугласэвся, прывіз мэнэ тудэ на кулёнію, о, ну, і я лыжу, лыжу і так о як вэкрунуся вжэ на лівій бік, бо в мэнэ вжэ на спэны пролыжні булэ, шо я всё на спэну лыжала, на тэх кірпічах. В мэнэ зрубэлыся пролыжні і я вэкрунусь на лівій бік, а мэнэ тут дэ нуга вэйшла з сустава такіе чырвоны пятно. І прыйшла ду нас баба, матэрына маты, і я кажу, шо вжэ мні тут о ны так булэт. Я пувырнулася, а вуна кажэ: «О, в тэбэ такое чырвонэ пятно, чуго вуно». І так пробуе і пробуе. Кажэ: «А, в тэбэ ямка, — кажэ, — знайіш, шо в тэбэ нуга вэбыта». Я кажу: «О кулэ Вітэ поннялы, шо вэбыта нуга, почему, — кажу, — ны раньшэ, булэ бы мэнэ ду куступрава завызлэ бы». В Мэнькувыч був куступрав. В діда кінь був, то не хутчэй в бульніцу путягнулы. Ну, і я так була, мусыть, с пувгода. Кулу хаты давай всё худэла з палкію, после стала худэты быз палкі, накульгувала троху, троху вуна в мэнэ,

ны дужо, була куротча, ліва нуга. Худэла з палкію, посля стала худэты на руботу, мэнэ вызывалы туда, на тую кумісію, првуэрялы, далэ мні втарую групу. О, я худэла на руботу, п’ять літ в тіпліцы рубэла, брыгадір на вісувую пуставыв, там як шо возять, вузэлы торг, навоз возять, всё через віса важылы. Мэнэ станувэть на віса, я важу стую всё. О, і той Костя кажэ тому Мішкувы, Мішка вжэ прійіхав.

Як ворожылы

Девочкі, і вуружінне справляйіцця. Слухайтэ, тутака в нас удна прійіхала пулячка, а тут уднэйі сэн, вжэ юго мілы, ну, садувэты за рышотку. Вуна ду мэнэ прыходыть, тая баба Манька, і кажэ: «Олька, пашлі ду Кукушкі, мні трэба пувуружэты». А я кажу: «Пашлі». Заходым мэ тудэ далій, ду тэйі Кукушкі, фамілія Кукушкі. Вуна рускінула карты юй і кажэ: «Хм, — дэвіцця на ейі і кажэ, — шо-то вашуму сэнувы предстуіт казённый дом». А вуна сразу сбэліла, тая Манька. Ну, і так о далій трэ разы рузлужэла і кажэ: «Він будэ в казённум думові, но я, — кажэ, — ны мугу пуняты». Казённый дом і бульніца, то ж так ворожка ны скажэ, і казённый дом тюрма. А я йійі тулкаю, тюрма будэ, бо він там удному всадэв штахету в голову, з гоздём, свадьба була і юго за тое судэлы. О, ну далэ мэ юй по трэ рублі, тылько кусты на старэйі грошы. І я юй кажу: «А пувуружітэ мні, шо мэнэ впэрэді ждэ». Вуна рускладуе карты і кажэ мні: «Ду тэбэ будэ траплятыся мужэк червенный, він жывэ зара вэймэ далёко, но він через пару літ прійідэ і ты будеш з йім жэты». Я думаю, шо вуна плытэ тая баба, дэ червенный, в світы далёко жывэ і він прійідэ сюдэ і будэ зу мною жэты. Вэйшлы мэ на двір і я юй кажу, тый бабы Маньцы, кажу: «Ну Вам то сказала правду, а мні не, — кажу, — червенный, в світы будэ сюдэ йіхаты». І, девочкі, пруйшло, мусыть, ны знаю скілько літ, і точно. Прійіхав о ду матыра. Той Мурузюк пас курувэ і він пас калхозны курувэ. Прыходять вунэ в вэчуры убэдва. Той Костя кажэ: «Олька, я тубі прывів Мішку, я, — кажэ, — хучу вас спаруваты. Тэ удна, дукіль тэ будэш удна, тубі удный тяжко, — кажэ, — хазяйство дыржэш, двое свынэй, курова, куры, всё, сама всё робыш». Я кажу: «А я ду руботы прывэчна, — я кажу, — я быз руботы ны мугу, о, — а я кажу, — а начёрта я юму сдалася, шо він ліпшыйі ны найдэ». А він кажэ: «Знайіш шо, я бы тэбэ ны пруміняв бы на якую-ныбудь такую упіёшу, як тут е бабэ, — кажэ, — тэ хазяйка добра, тэ ны запывайісся, нычого, хазяйство добрэ выдэш, тэ всё рубэты вмійіш». Ну, і всё так пугувурэлы, посля той Мішка знов прышов. Ну, і так він пружэв, той Мішка, в мэнэ дваццыть удён год.

— *А дзеці ў Вас былі?*

— Не, а я вжэ була ны мулудая, ны було дытэй.

— *Як Вы святкавалі Івана-Купалу?*

— В нас тут такій пыружок був, то в вэчіры кастёр палэлы, шэ була раз трава загурілася, то давай тушэты, то я і свэтра спалэла, траву бэла, куб далій ны пушло. Пудпылэ троху і пуйшло пу траві сухій, давай трава гуріты. А я кажу: «Шо вітэ робытэ? То ж сыло спалымо, дуйдэ ду сыла. Трава бальшая, ны пукошанэ, там на пыружковы». І это, і пушло пу траві сухій, а вуно пламынём, чуть-чуть вжэ і оньдэ, і палахае.

Пра Сталіна

— Я худэла ду школы во втарэй клас. Була в нас учітельніца Кулёнок. Каждый тэждынь в нас було пеніе і мэ спывалы пісню. Тугдэ Сталін був, пру Сталіна.

Сабіралісь казаченькі,
Сабіралісь на заре.
Думу думалі бальшую
На калхозным, на дворе.
Чтобы нам сейчас, ребята,
В гості Сталіна позвать,
Чтобы Сталіну родному
Все богатства показать.
Показать бы, похваліться
Нашей схваткой байівой.
Пріезджай, товарішч Сталін,
Пріезджай, отец радной.
Пріезджай, товарішч Сталін,
Пріезджай, отец радной.
Будіш ехать сам увідеш,
На калхозным, на дворе
Расцвітают наші деті
Алым цветом на заре.
Расцвітают наші деті
Алым цветом на заре.
Будіш ехать сам увідеш,
Палюбуйся красатой,
Як хлеба цветістым маем
Уміваецца расой.
Як хліба цветістым маем
Уміваецца расой.
Будіш ехать сам увідеш,
На калхозным, на дворе
Расцвітают наші деті
Алым цветом на заре.

— А колькі Вы класаў закончылі?

— Ой, трэ класы, дуругенька, мало я кончіла, бо мэ жылэ, мусыть, кіломытрув штэры ут школы, а вбутысь ны було в шо, зыма, снігу за куліна, як то з хутора було йты далэко. Сюдэ о до сёго сыла, мусыть, було кіломытрув два йты. А шэ утсіль ду школы було в Вельмовычы. І я на ногу забуліла в трінаццыть літ і всё. Вжэ як на ногу забуліла, муя школа кончілась, а учэлася я добрэ, о то учэлася добрэ. В мэнэ був талант такій ду всёго, і ду песінь, і ду наукі, тылько бачітэ шо, ніпавізло, впала з чырэмыхі і всё. Ну, алі якось жыла, шэ була мулудая, а тыпірычко о пустаріла, зрубэла упірацыю на око, спыршу ныбы бачыла ліпій, а тыпірычко вжэ ут шыстого мая пушов вусімдісятый год, всё сліза з юго йдэ. І мні катаракта затягуе очі і я ныхулеры ны бачу. Капала, а вжэ тыпіро і капанне ны пумагае і всё. І тако як сама, то я буюся йты в той гурод, бо шэ пуд хату ны траплю. Шэ як выдный на двурі, то я ліпій бачу, а як нахмурыцця, я мугу з стэжкі збэтыся і дэ-ныбудь влізу в бурьян, впаду з тэю табареткію і ны вэлізу. То худэла була з двыма, то з уднэю палкію, посля з двыма, а вжэ тыпірычко стала з табаретію худэты. Дэ йду, тяжко, сяду на табаретку, пусыджу, далій йду. О, о такая, девочкі, жізь.

Пра жыта і жніво

— А Вы хадзілі раней жыта жаць?

— Ой, худэла я, і жяла, і картоплі калхозны худэла купаты, ду всёго я худэла пука мугла, а куму було рубэты, худэла. В сім літ вcталася быз батька, я всё вмію рубэты.

— А якія песні спявалі, калі жыта жалі?

— А, то спывалы, я вжэ і забулася. Як начінають шося жаты, то спывають. О, мэ, худэлы, я худэла, ну в калхоз худэла. Всё время я в калхоз худэла.

То мэ за жнываркію в’язалы, то там бабэ спывалы, тожэ тую пісню. Дзень стаіць пагодны! Я бабам так о, это, сядым на пырыкур, в’яжымо жэто, длінны палоскі, жныварка жнэ, шэ ж тэх камбаюв ны було, кіньмы тёгалы жныварку. Два, пара коны ду убіда, удна пара коны, пу убіды другу запрагають і жнуть конною жнываркію. Як глянь всё жмыні, жэто лыжэть, в радэ лыжэть. І мэ, я бабам крычу: «Бабэ, пырыкур!» А нас там будэ баб дваццыть вязаты. Кажу: «Бабэ, я вам зара стіхатваренне скажу».

Жніво

Дзень стаіць пагодны
А ня воднай хмаркі.
Па калгаснай ніве
Коцяцца жняяркі.
Роўнаю палоскаю
Следам высцілае,
Жыта ей пакорна
Каласы сцілае.
В’яжуць жонкі жыта
Спелае, буйное,
Працаваць так лёгка
Дружна гарманою.
Не баляць ім плечы
І не ломіць спіна,
Памагае ў працы
Ім цяпер машына (смяецца).

— ***А калядаваць хадзілі?***

— Ай, шо то кулядуванне? Як мэ тугдэ худэлы, тыпэр ходять кулядують, то канфеты дають, а як мэ худэлы. Як я з кулёнійі прыду, кулядую, то нам ныхто і картоплі ны вэнысэ. Ходым, змэрзным, як я сюда прыду в сыло, а пука на хутор зайду дудому, то змэрзну, лыкучу. І зайду, і там в хаты зэмно, бо палэты ныма чэм. І так, мусыть, зімів дві пухудэла, а после кажу: «А чуго я піду в такую даль?».

04.07.2014 г.

Запісала студэнтка 1 курса БрДУ імя А.С. Пушкіна па спецыяльнасці «Беларуская філалогія (літаратурна-рэдакцыйная дзейнасць)» Драгун Алеся Анатольеўна.

Захоўваецца стылістыка і арфаграфія аўтарскай мовы.

Тэкст захоўваецца ў вучэбна-фальклорнай лабараторыіі БрДУ імя А.С. Пушкіна (кіраўнік І. Швед), а таксама ў фальклорным архіве Метадычнага цэнтра (кіраўнік Г. Петруковіч) аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі (кіраўнік Л. Балашова) Брэсцкага райвыканкама.



НАРОДНЫЯ ПЕСНІ ПРЫБУЖЖА

КАЛЯДНЫЯ ПЕСНІ

Васылёва маты
Пошла мандроваты:
На новое лито
Роды, Божэ, жыто,
Жыто, пшеныцю,
Горох, сачывыцю.
Дэ долынка —
Там копынка.
С колосочка —
Жыта бочка.
А в клуны вмолитно,
А в дисцы захидна.
А в печи як рожа,
Господынька гожа.
Пич вымытае,
Пырогы сажае.
Шчодрый вэчур настав,
Мэнэ батько послав.
Рижтэ сало, кубасу,
Я й додому понысу.
У-гу-гу,
Дайтэ того, що на рогу.
Кышкы, кубаскы,
Шэй ложэчку кашкы.

Запісана студэнтам Селівонікам В.І. ад Селівонік Н.І., в. Тэльмы Брэсцкага раёна.

ВЯСЕЛЬНЫЯ ПЕСНІ

Ой, як жа мне вечара даждаці,
Бо мы едзем дзяўчыну сватаці,
А як пашлю таварыша дахаты,
А сам стану пад акно слухаці,
А сам стану пад акно слухаці,
А що-то будзе дзяўчына казаці.
Дзяўчынонька па святліцы ходзіць,
Да сэрдэнька белы ручкі ломыць

Ды мацеры пацiху гаворыць:
— Мацi, мацi, парадніца ў хаце,
Парадзь мне, шчо людзям казацi.
Цi мне, мацi, ручанькi давацi,
Цi маладой лягаць умiрацi?
— Лепей, доню, ручанькi давацi,
Чым маладой лягацi ўмiрацi.
— Лепей, мацi, на тым свеце гнiцi,
Чым з нялюбым на гэтым свеце жыцi.
Пашый, мацi, белу сарочку,
Схавай мяне ў вішнёвым садочку,
Высып, мацi, высокую магiлу,
Пасадзi на ёй чырвоную калiну.
Прыйдуць хлопцы па саду гулянi,
Будуць хлопцы калiну ламацi.
Тут калiна салодка, не гiрка,
Бо тут ляжыць засватана дзiўка.

Запiсана студэнткай Рудскай М. ад Барысюк Вольгi,
в. Астрамечава Брэсцкага раёна.

***

У нашуго свата гулува кудлата,
Гулувою путрасэ, нам горилки прынысэ.

Ой, знаты, знаты, хто любыть дружку:
Вытуптаў стэжыньку чэрыз пэтрушку.

Ой, знаты, знаты, хто нэжинатый
Набик шапоньку — пушоў гуляты.

Ой, знаты, знаты, хто ўжэнывся,
Скорчывся, згорбывся, шэй зажурывся.

Запiсана ад Дзямешка Еўдакii Iванаўны (40 год ў 1960 г.),
в. Каростычы Брэсцкага раёна.

***

Ой, родэ, родэ вэльмо богаты
Нэ стый у синях, просым до хаты,
Пэрепываты.
Нэвэлыкым даром — бытым доляром,
Нэвэлыкым бытом — пшэныцею, жытом,
Кiньмы, воламы шэй коровамы.

Заўвага iнфарманта: спяваюць пры дзяленнi караваю.
Запiсана студэнткай Ульянiцкай В.I. ад Валынчук Марыi Раманаўны
(1901 г.н.), в. Плоска Брэсцкага раёна.

***

Хуруша краса Зосенька наша,
Як з вэнцю прыихала,
Похуришчала, покраснийшала.
Еи матюнка, еи ридная
На еи поглядае
— Дэсь ты, дочэнька, калыною ўмывалась,
Розою втыралась.
— Я калыною нэ ўмывалась,
Розою нэ ўтыралась.
Я вудыцёю ўмывалась,
Ручнычком втыралась,
Я такая, як муй батэнько,
На пусаг удалась.

Запісана студэнткай Ульяніцкай В.І. ад Валынчук Марыі Раманаўны (1901 г.н.), в. Плоска Брэсцкага раёна.

***

Зосенька батэнькувы одслужыла,
На стули сэрпочка положыла.
Хто тым сэрпочком будэ жаты?
Будэ батэнько прынайматы,
Чытыры злоты в дэнь даваты.
Так нэ будэ вирно жаты,
Будэ на сонычко поглядаты.
Хучий, сонычко, за хмараньку,
А нам, жинчикам, додоманьку.

Заўвага інфарманта: спяваюць, як нявеста адʼязджае да жаніха.

Запісана студэнткай Ульяніцкай В.І. ад Валынчук Марыі Раманаўны (1901 г.н.), в. Плоска Брэсцкага раёна.

***

Оличка по саду ходыла,
Цвит-калыну ломала,
До лычка прыкладала,
Свою матыньку пытала:
— Чы я буду такая,
Як калынонька сяя?
— Будэш, дытя, будэш,
Покыль у мэнэ будэш.
Як пуйдыш до чужого
До свикорка свого,
То спадэ з лиця краса,

Як од сонэйка раса.
Высушыть головоньку,
Як витёр круту гороньку,
Як туман лышчыноньку,
Так той чужый батынько
Чужую дытыноньку.

Запісана студэнткай Ульяніцкай В.І. ад Валынчук Марыі Раманаўны (1901 г.н.), в. Плоска Брэсцкага раёна.

***

В суботоньку звычороньку,
В нэдилю поранэнько
Там маты сына выражала,
Выражаючы, навучала:
— Нэ ийды, сыноньку, до дивоньки,
А впэрод поийдь до цэрковки.
Як выслухаеш обидоньку,
Тогды поийдэш до дивонькы.
— Быстрого, матынько, коня маю,
На поводах нэ втрымаю,
Шелковы поводы порывае —
Так до дивоньки поспешае.

Заўвага інфарманта: песню пяюць госці маладога перад ад'ездам жаніха да нявесты.

Запісана студэнткай Ульяніцкай В.І. ад Валынчук Марыі Раманаўны (1901 г.н.), в. Плоска Брэсцкага раёна.

***

— Ой, на дэнь добрый, добрые люды, нам до вас,
Чы ны прыплыла наша й утонька тут до вас?
— А якая й ваша ўтонька, якая?
— Наша й утонька мыж вашымы значная:
Чорное крыльцэ, билое пэрцэ — такая.
Ой, на дэнь добры добрыи люды нам до вас,
Дэсь заблудыло наше й дитятко тут до вас.
— Ой, яко ей ваш эй дитятко, якое?
— Наше й дитятко мыж вашымы значное:
Билое лычко, чорное очко — такое.

Запісана студэнтам Селівонікам Віктарам Іванавічам ад Селівонік Наталлі Іосіфаўны (1902 г.н.), в. Тэльмы Брэсцкага раёна.

***

— Ой, чы радый ты, а муй батэньку,
мойому прывозовы?
Ой, а чы рад, ой, а чы рад
той за стил завыдимо.
Ой, чы ны рад, ой, чы ны рад,
той назад одвэзимо.
— Ой, радый я був ты, муй сыноньку,
як ты вродывся,
Тэпэр раднийши, шей высылийши,
шо вжэ ты й ожынывся.
Ой, радый я був, ты муй сыноньку,
як тыбэ вповывалы.
Тэпэр раднийши шей вэсылийши,
що тыбэ й вквытовалы.

Запісана студэнтам Селівонікам Віктарам Іванавічам ад Селівонік Наталлі Іосіфаўны (1902 г.н.), в. Тэльмы Брэсцкага раёна.

***

Ридны батэнько, розвытаймося,
Розвытаймося, росстаемося,
Запылы мэнэ на столи ў тэбэ.
За столык зайдэш — мэнэ ўспумынэш:
Дэсь муе дытятко на чужуй сторонцы,
На чужуй сторонцы ў чужого батэнька,
А чужый батынько бэз выны карае,
Бэз выны карае, бэз вуды ўмывае,
Слёзкамы ўмыесся, ручкамы ўтырэсся.

Запісана ад Дзямешка Еўдакіі Іванаўны (1920 г.н.), в. Каростычы Брэсцкага раёна.

***

Ой, нэ рый, нэ рый яра пчолунька по бору,
Идэ Колечка из дружыною додому,
Як прийхав вун пуд вуротэчка схупывся,
Свуюй матёнцы ду билых нужок склунывся.
— Ой, ны гардуй, моя матюнка на мынэ,
Шчо я привиз чужое дытя ду тэбэ.
— Чы добры будэш, муй сыночок, ду мэнэ,
То прыйму чужое дытя ду сэбэ.
Як гордый будыш, муй сыночку, ду мэнэ,
То ўдэшлю чужое дытя од сэбэ.

Запісана ад Дзямешка Еўдакіі Іванаўны (1920 г.н.), в. Каростычы Брэсцкага раёна.

ВЯСЕЛЬНЫЯ ПРЫПЕЎКІ

Ой, казалы ворогы,
Говорылы люды,
Шо нашому Ванички
Парочки ны будэ.

***

Ой, казалы вороги,
Шо ны ожэнюся,
Я й такую жинку взяв,
Шо й ны надывлюся.

***

Ой, осот на чырот
Ны нахылыцця,
А Ванюша на Верочку
Ны надывыцця.

***

Ой, осот на чырот
Ужэ нахылывся,
А Ванюша на Верочку
Ужэ надыввся.

***

Ой, маты, моя маты
Нашо мэнэ жэныш,
Забэруть мынэ в солдаты,
Куды жинку диныш.


***

Выпыты то то я,
Закусыты то то я,
До роботы блять бокы,
Бо ны сыла моя.

*Запісана студэнтам Селівонікам Віктарам Іванавічам
ад Селівонік Наталлі Іосіфаўны (1902 г.н.), в. Тэльмы Брэсцкага раёна.*

Заўвага. *Матэрыял быў сабраны студэнтамі Брэсцкага педагагічнага інстытута под кіраўніцтвам прафесара Уладзіміра Калесніка ў 60-х гадах мінулага стагоддзя. Вытрымана стылістыка і арфаграфія аўтарскай мовы. Захоўваецца ў вучэбна-фальклорнай лабараторыі БрДУ імя А.С. Пушкіна (кіраўнік І.А. Швед).*

НАРОДНЫЯ СВЯТЫ І ЗВЫЧАІ БЕРАСЦЕЙШЧЫНЫ



Восеньскія святы на Прыбужжы

«Богославў хлопцаў по дэвчатём разослав»



Іна Швед,
доктар філалагічных навук, прафесар кафедры беларускага літаратуразнаўства БрДУ імя А.С. Пушкіна

На Берасцейшчыне святкуюцца такія восеньскія святы, як Макавей (14 жніўня), Яблычны Спас (19 жніўня паводле праваслаўнага календара), Першая Прачыстая (28 жніўня), Галавасек (11 верасня), Цуды (19 верасня), Другая Прачыстая (21 верасня) і інш. Называюць звычайна 12 гадавых святаў, апошнім з якіх лічыцца Увядзенне ў храм Божай Маці ці Мікола Зімовы (19 снежня ў праваслаўных):

«Ну вот начиная с Рождества Христова и заканчивая Введением 4 декабря. Там еще Микола будет. Вот последний праздник. Вот в эти праздники не надо что-то делать. Резать, где-то что-то пилить, сядь-ка, посиди лучше. Если люди идут в церковь, посиди, не надо. У нас в деревне, я жила в Малых Зводах, там была такая баба Миля, жила такая у нас, Абромчук, она католичка. Она католические праздники очень праздновала. Но вот нельзя, если человек празднует, зачем соседу стирать белье, развешивать, зачем ему грязь свою? Не надо. У нее праздник, ну и ты попразднуй с ними. Праздников у нас в жизни не много. Надо уважать. Я считаю, это самое главное» (Зводы Брэсцкага р-на; Брынза Вера Фамінічна, 1949 г.н., беларуска, зак. 10 кл. сярэдняй шк., праваслаўная).

Усе гэтыя святы апавіты сістэмай вераванняў, забаронаў (у першую чаргу, на працу), абрадаў. Прыкладам, Першая Прачыстая лічылася святам ураджаю,

у гэты дзень свяцілі розныя расліны, зерне: *«Вот на Сплениe, на Успение, на Успінне, как у нас говорят, мы все время святим цветочки в церкви. Ну, у нас гвоздики в основном, ну, знаете, такие крупные, астрочки тоже туда, барвинак, его еще святым деревом называют. Оно пахнет очень вкусно. Вот его приносили с церкви, оно посвященное. С церкви приносишь, ставишь на окно, и оно высыхает и стоит до следующего года»* (Ляплёўка Брэсцкага р-на; Лялько Лідзія Іванаўна, 1957 г.н., беларуска, выш. адук., правасл., мясцовая).

Адмысловымі храналагічнымі межамі, якія падзяляюць год на лета і зіму, лічацца святы Уздзвіжанне і Пакровы. Уздзвіжанне (Чэсны Хрэст), паводле праваслаўнага календара, адзначаецца 27 верасня, а каталіцкага — 14 верасня. Вераць, што ў гэтае свята зямля пачынае рухацца, «уздзвігацца» на зіму, і ў яе ўваходзяць вужы, гадзюкі, яшчаркі, каб застацца там да Благавешчання — храналагічнай мяжы лета. На Уздзвіжанне паўсюдна забаранялася хадзіць у лес, каб не сустрэцца з «гадамі», якія нібыта збіраюцца ў вялікія клубы: *«Нельзя в лес. Потому што змеи собираются. Люди видели много этих змей»* (Ляплёўка Брэсцкага р-на; Лялько Лідзія Іванаўна); *«Это тот празднік не добрэ ідці ў лес. Мы адзін раз пайшлі з адной жэншчіной па грыбы, вот сюда, как на Александрова ісці, глянула: і тут вуж, і тут вуж, і тут вуж! Я думала, сэрца лопнэ. Як я выскочыла і стала крычаць, ана прышла і мы домой пошлі. Так шо лучшэ не ідці на Уздзвіжанне ў лес, лучшэ не ідці»* (Орхава Брэсцкага р-на; Жук Соф'я Трафімаўна, 1926 г.н., беларуска, правасл., мясцовая, скончыла пяць кл.). Гэтая выключная праява актыўнасці «гадаў» можа тлумачыцца тым, што змеі святкуюць свае «вяселлі» перад тым, як выправіцца на зімоўку: *«На Воздвиженье в лес ходить нелься. У змей как раз свадьбы какие-то, и они уходят куда-то... Прячутся на зиму. В землю»* (Зводы Брэсцкага р-на; Брынза Вера Фамінічна). Калі ўжо давялося ў гэты дзень трапіць у лес, то не трэба чапаць гэтых істот, а «быць з Богам»: [А если человек подойдет, что будет?] *Могут напасть, покусать. Но я была в прошлом году в Пружанской пуще 27-го... Ничего, видела змей, ужей... Не трогай. Не обращай внимания. Они своими делами занимаются, а ты своими. Идешь с Богом и выйди с Богом. Не делай вреда...»* (Зводы Брэсцкага р-на; Брынза Вера Фамінічна). Асоба рэгламентавалася ў свята Уздзвіжання практыка прынясення чаго-небудзь з лесу. Лічылася, што ўсё (як станоўча, так і адмоўна ацэненае) прынесенае ў чалавечую прастору будзе весціся, пладзіцца, добра расці: *«И, если дохаты принесешь что-нибудь такое вот, там лягушку, что-нибудь такое, то будет водиться все время в хате вот это... А вообще вот, если хочешь что-нибудь хорошее такое посадить в этот день или что такое, то тоже будет вестись»* (Ляплёўка Брэсцкага р-на; Лялько Лідзія Іванаўна).

Як пачатак восеньскіх вяселляў вядома на Берасцейшчыне свята Багуслаў (9 кастрычніка), які «сватоў разаслаў», а «на Покрова — дівка готова». *«До Пречиста — девка чиста»*, *«Богослаў хлопцаў по дэвчатём разослав»*, *«На Покрову девка готова»* (Збірагі Брэсцкага р-на; Калчук Р.В., 1938 г.н., беларуска). Апошнім днём сватання лічылася 8 лістапада — дзень святога Дзмітрыя Салунскага.

Пакровы па праваслаўным календары адзначаюцца 14 кастрычніка. У народных уяўленнях гэтае свята лічылася жаночым і звязвалася з тым, што Божая Маці «пакрывае зямлю і людзей ад усялякага гора».

«Покровы — бо покровітельница того дня — Божа Маты — роскынула над зэмлёю свуй покрыв (покрывало з головы). Той дэнь шчытаецця жэнцкім днём, бо Божа Маты — то ж жэншчына. Ну от і шчытаецця, шо вона як маты покрывае нас от всёго кепского» (Альха Брэсцкага р-на, Шмыдкая Кацярына Міхайлаўна, 1924 г.н., бел., прав., мясцовая). Да Пакроваў павінны былі быць завершаны ўсе палявыя работы, ураджай складзены на захоўванне, а свойская жывёла — пераведзена на стойлавае ўтрыманне. *«Хто сее на Покрове — нэ будэ чого даты корове», «Прыйшла Покрова — нэ дала молока корова»* (Кустын Брэсцкага р-на; Янчук Ганна Фёдараўна, 1931 г.н., беларуска, правасл., мясцовая).

З народнай этымалогіяй слова «Пакровы» звязаны ўяўленні і адпаведныя парэміі пра тое, што многія аб'екты свету, у тым ліку людзі, жывёлы, расліны і сама зямля, павінны быць пакрыты адпаведнымі ім рэаліямі: *«На Покровы козалы, шчо: «Покровы покрываюць пчалу мёдам, воду лёдом, траву лісцем, дрэво корою»* (Кустын Брэсцкага р-на; Янчук Ганна Фёдараўна). На Пакровы, як і іншыя святы, намагаліся зрабіць метэаралагічныя прагнозы, вызначыць надвор'е, а дзяўчаты варажылі, імкнуліся забяспечыць сабе шлюбы (Кустын Брэсцкага р-на; Янчук Ганна Фёдараўна). У многіх вёсках на Пакровы наладжваліся кірмашы, гулянні, куды з'язджаліся з усяго наваколля, у наш час — канцэрты: *«У вёску прыяжджалы кірмашы, продовалы много цікавого, шчо зробылы своімы рукамы»* (Кустын Брэсцкага р-на; Янчук Ганна Фёдараўна); *«Покров — дзень дзеревні: касцёры, торговля, прізы, конкурс лучшіх подворій, выступае народны хор Дома культуры»* (Орхава Брэсцкага р-на; Недашкоўская Надзея Іванаўна, 1957 г.н., пісьм., праваслаўная, мясцовая). Пасля Пакроваў жанчыны апрацоўвалі лён, займаліся шыццём. Дарэчы, сярод нешматлікіх восеньскіх песень вызначаюцца спецыяльныя ільняныя, прыкладам:

Посіялы дівкі лён, — 2 р.
Посіявшы пололы, — 2 р.
Білы рукі кололы, — 2 р.
Уладыўся сывы конь, — 2 р.
Помяв, стоптав дівкам лён. — 2 р.

(Вялюнь Брэсцкага р-на; Мазалюк Галіна Міхайлаўна, 1924 г.н., беларуска).

Апякункай жанчын, дзяўчат, шлюбу лічылі Параскеву Пятніцу (яе свята — 10 лістапада). Калі дзяўчаты клаліся спаць, загадвалі: «Пятница, пятница, милая сестрица, кто меня любит, пусть мне приснится». Матрыманіяльная тэматыка актуалізуецца і падчас свята ў памяць з'яўлення іконы Святой Божай Маці ў Казані (4 лістапада), у прыватнасці парэміях: *«Хто на Казанску жаніхаецца, той нэ покаіцца»*. На гэты дзень выпадалі і метэаралагічныя назіранні: *«Як Казанска скажа, то й зыма пакажа»* (Кустын Брэсцкага р-на; Драб Зінаіда Станіславаўна, 1927 г.н., беларуска, правасл., мясцовая).

